**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2019 г.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу “Канікулы ў бібліятэцы”

**1 жніўня.**

Новых наведвальнікаў запрасіла ў госці бібліякафэ «Хороший вкус», якое працуе ў бібліятэцы. Дзеці сталі дэгустатарамі салаты з прыказак, кактэйлю з загадак, а на дэсерт ім прапанавалі торт «Новинка» (агляд кніжных навінак).

Кіселявецкая ПБ, 26 чал.

«Дружба начинается с улыбки» – пад такім дэвізам адзначаўся Міжнародны дзень сяброўства ў Верхалессе, падрыхтавана аднайменная выстава. Сумесна з ДК праведзена конкурсна-гульнявая праграма, у якой дзеці спаборнічалі ў спрыце і кемлівасці, удзельнічалі ў віктарыне «Соображай-ка» і ўспаміналі цёплыя словы і кампліменты *(Кобрынскі веснік. 2019. 21 жніўня. С. 5).*

Верхалеская ПБ, 30 чал.

**8 жніўня.**

Юныя карыстальнікі бібліятэкі здзейснілі літаратурнае падарожжа па казках народаў свету «В гостях у любимой сказки». Дзеці адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны, угадвалі герояў казак па апісанню іх партрэтаў, па фрагментах тэксту рабілі выснову, каму нелажаць прачытаныя словы. У канцы прагледзелі мультфільм «Чип и Дейл»

Акцябрская ПБ, 21 чал.

У бібліятэцы дзеці са сваімі бабулямі сабраліся на літаратурную гульню «На балі ў Мухі-Цакатухі». Яны знаёміліся з творчасцю Карнея Чукоўскага, гулялі ў гульні, адказвалі на пытанні віктарын «Успомні казку па ўрыўку» и «Хто ёсць хто», разам з Федорай і Майдадырам наведалі «Бюро знаходак» і дапамаглі героям знайсці згубленыя рэчы.

Лукская ПБ, 25 чал.

**11 жніўня.**

Бібліятэка запрасіла юных чытачоў на гульнявое асарці «Мы будем книжки узнавать, шутить, угадывать и удивляться». Дзеці ўдзельнічалі ў пазнавальных віктарынах, разгадвалі загадкі, спаборнічалі ў гульнях.

Стрыгаўская ПБ, 27 чал.

На гадзіне любімай казкі «А ў казкі ціхі галасок» дзеці разам з бібліятэкарам узгадвалі беларускія народныя казкі, чыталі ўслых урыўкі з любімых твораў, адгадвалі загадкі, гулялі ў гульні.

Балоцкая ПБ, 20 чал.

У бібліятэцы на пасяджэнні клуба «Аленький цветочек» «Суём свой нос в любой вопрос» прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення часопісаў, выставай «Дзіўны свет часопісаў і кніг», адгадвалі летнія загадкі, удзельнічалі ў рухавых гульнях.

Бухавічская ПБ, 20 чал.

**14 жніўня.**

У бібліятэцы дзеці сталі ўдзельнікамі гульні-падарожжа «Чтение – лучшее увлечение». Яны знаёміліся з кніжнай падборкай «Чемоданчик в дорогу»,

адказвалі на пытанні віктарыны, рашалі крыжаванкі, адгадвалі загадкі, успаміналі прыказкі аб чытанні. Завяршылася мерапрыемства дыскатэкай.

Кіселявецкая ПБ, 24 чал.

**15 жніўня.**

Юныя чытачы бібліятэкі далучыліся да сацыяльна-экалагічнага праекта «Новая жизнь в обмен на крышечки». Падчас арганізацыйнага мерапрыемства дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, успаміналі праказкі і прымаўкі пра дабрыню, расказвалі, якія апавяданні і казкі пра дабрыню і міласэрнасць прачыталі летам. Бібліятэкар зрабіла агляд кніжнай выставы «Через книги к добру и свету»

Батчынская ПБ, 29 чал.

**17 жніўня.**

Падчас пазнавальна-гульнявой праграмы «Месцы асаблівай небяспекі» дзеці даведаліся аб правілах бяспекі пры эксплуатацыі хатняга электраабсталявання, правілах бяспекі на вадаёмах, пры выхадзе ў лес. Прысутныя прынялі ўдзел у гульнях, віктарынах, адгадвалі загадкі. Дапаўненнем да мерапрыемства сталі відэакліпы аб небяспечных паводзінах.

Шамятоўская ПБ, 26 чал.

**18 жніўня.**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і адпачынку правялі пазнавальна-гульнявую праграму «Три великих Спаса». Дзеці ўдзельнічалі ў гульнях і конкурсах, а адказы на пытанні віктарыны «Что мы знаем о пчёлах?» можна было знайсці на кніжнай выставе «Три Спаса». Закончылася мерапрыемства чаяпіццем.

Залеская ПБ, 25 чал.

У бібліятэцы прайшоў праваслаўны ўрок «Солнечный праздник – Яблочный Спас». Акрамя гутаркі пра свята дзецяй чакалі «Яблочные забавы».

Гарадзецкі філіял, 25 чал.

**25 жніўня.**

На гадзіне чытацкіх задавальненняў «Вольны час з карысцю ў бібліятэцы» дзеці ўдзельнічалі ў конкурсе «Пазнаю свет з кнігай», у віктарынах «Падкажы славечка», «Назаві героя», выканалі творчыя работы «Цуды з паперы».

Шамятоўская ПБ, 28 чал.

## <u>Мерапрыемствы да 80-годдзя Брэсцкай вобласці</u>

Выстава-панарама «Малая родина – большая любовь», якая экспаніруецца ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі, папоўнілася новымі раздзеламі: да 1000-годдзя г. Брэста – «Брест: вчера, сегодня, завтра», да 80-годдзя з дня стварэння Брэсцкай вобласці – «Брестская область в книжном формате».

ЦБ

## <u>Мерапрыемствы да 80-годдзя Кобрынскай цэнтральнай бібліятэкі</u>

Напярэдадні 80-годдзя Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і 115-годдзя з дня нараджэння першага яе дырэктара, краязнаўцы, гісторыка, публіцыста, грамадскага дзеяча, Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына А. М. Мартынава ў гісторыка-краязнаўчым цэнтры бібліятэкі пачала дзейнічаць юбілейная выстаўка-дас'е «Асоба ў гісторыі малой радзімы». Бібліятэкай сабраны шэраг матэрыялаў-даследаванняў на папяровых і электронных носьбітах пра знакамітага земляка, некаторыя з іх прадстаўлены на выстаўцы *(Кобрин-информ. 2019. 15 жніўня. С. 4; Кобрынскі веснік. 2019. 21 жніўня. С. 4).*

## Іншыя мерапрыемствы

**4 жніўня.**

У бібліятэцы прайшоў паэтычны вечар, прысвечаны творчасці Надзеі Момлік. Прэзентаваны яе новы зборнік вершаў «Почемучкой я расту», у выкананні А. Сыч и Т. Гурыш гучалі песні на вершы паэткі. Афармлена выстава «Тут жыло маё дзяцінства».

Дзівінскі філіял, 32 чал.

**16 жніўня.**

Работнікі вясковых публічных бібліятэк раёна сабраліся на Дзень творчага камунікавання «Каникулы в библиотеке: изучаем, предлагаем, внедряем». Значная ўвага надавалася сучасным патрабаванням да дзейнасці публічных бібліятэк у вёсцы і прасоўванню бібліятэкі ў віртуальнай прасторы. Вопытам удзелу ў акцыі «Полезные каникулы» падзяліліся бібліятэкары сістэмы.

ЦБ, 53 чал.

**20 жніўня.**

З літаратурнай гасцінай «Знаёмімся…» пачаў работу літаратурны клуб «ПоэтиКо» пры бібліятэцы. Знаёмства паэтаў прайшло ў форме вершаваных экспромтаў «Зарыфмую імя своё». Кіраўнік клуба пазнаёміла ўдзельнікаў з гісторыяй і тэорыяй рыфмы, у якасці практыкавання члены клуба падбіралі рыфмы да дадзеных рускіх і беларускіх слоў.

ЦБ, 8 чал.

Выканаўца Ефціфеева Н. П.
Тэл. 8-01642-2-36-81